Источник: "Звязда" - 2020-01-11

## КОРАТКА

• Дабрачынны інклюзіўны праект «Радасць у падарунак» стартуе 13 студзеня ў Беларусі.

• **Нацыянальны аэрапорт Мінск зноў стаў самым пунктуальным у свеце па версіі OAG.**

• ДАІ заклікае кіроўцаў быць асабліва ўважлівымі паблізу ўстаноў адукацыі.

• **Унікальнае найбольш поўнае даведачнае выданне пра расліны Беларусі ўбачыла свет. Над гэтай кнігай навукоўцы Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі працавалі больш за 20 гадоў.**

• Le Figaro ўключыла Беларусь у топ-20 турыстычных напрамкаў 2020 года, назваўшы нашу краіну «спячай прыгажуняй Еўропы».

• **Для раённых бальніц Магілёўскай вобласці у 2019 годзе была закуплена 31 машына хуткай дапамогі.**